


# 21 ЛЮТАГА - МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

***Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў***
***У. Караткевіч***

**Міжнародны дзень роднай мовы адзначаецца 21 лютага**. Гэты дзень быў заснаваны ў лістападзе 1999 года рашэннем Трыццатай сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЭСКА.

У свеце шмат разнастайных моў. У адпаведнасці з даведнікам Ethnologue, які распрацоўваецца і выпускаецца ў друкаваным і электронным выглядзе міжнароднай некамерцыйнай арганізацыяй SIL International, на планеце Зямля існуе больш за 7000 моў, на якіх людзі размаўляюць.

Спіс 10 самых распаўсюджаных моў свету (па ліку тых, хто на ёй размаўляе) выглядае наступным чынам: на малайскай мове і бенгалі размаўляюць па 210 млн. чалавек, на французскай – 220, партугальскай – 250, рускай – 290, хіндзі – 380, арабскай – 490, іспанскай – 517, англійскай – 840 і звыш 1 мільярда чалавек размаўляюць на кітайскай мове.

Шэсць моў — англійская, арабская, іспанская, кітайская, руская і французская – маюць статус афіцыйных моў ААН.

***ЮНЭСКА прызнае беларускую мову другой у свеце па мілагучнасці!*** На першым месцы – італьянская мова.

Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбітаў. Нам, беларусам, у спадчыну дасталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная.

Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова!
Матчын дарунак ад самай калыскі,
ты самацветаў яскравая нізка.
Кожны з іх барвы дзівосныя мае,
вечным агнём зіхаціць - не згарае.
Ты мне заўсёды была дапамогай,
дзе б і якой ні хадзіў я дарогай.
Чую ў табе пераразвоны крыніцы,
чую ў табе і раскат навальніцы,
чую павевы зялёнага бору,
водгулле працы у родным прасторы.
Кожнай драбнічкай ты варта пашаны,
кожнае слова вякамі стварана.
І на вякі яно жыць застаецца,
вечнае так, як народнае сэрца.

У нашай краіне дзве дзяржаўныя мовы: руская і беларуская. Але дзе зараз пачуеш родную, нашу беларускую? Большая частка насельніцтва – каля 70% - у побыце карыстаецца рускай мовай.

Цяпер і ў вёсцы не пачуеш чыстую мову. У асноўным усе размаўляюць на «трасянцы». Мы ўжываем рускія словы, а націск у большасці выпадкаў ставім на беларускі манер, таму ў рускамоўным асяроддзі беларусаў пазнаюць адразу.

Зрэдку - па радыё, яшчэ радзей – з экранаў тэлевізараў пачуеш роднае слова. Я яго трэба захоўваць і развіваць не меньш, чым тую эканоміку, бо гэта, можа, і найважнейшы прэстыж краіны.

Пагавары са мной на мове,
На нашай роднай, не чужой.
Адчуеш ты — у кожным слове
Душа яднаецца з душой.
І сэрца сэрцу адкрывае
Свае духоуныя сады —
Там салаўіны хор спявае,
Там смак крынічнае вады.
Там рэха продкау прамауляе
Малітвы светлыя здалёк,
Нібыта нас благаслауляе
На добры шлях, на лёгкі крок.
У словах тых — надзеі нашы
І нашы мары пра жыццё.
Калі мы з мовай —
Нас не страшыць
Ні гвалт,
Ні мор,
Ні забыццё.
Пагавары са мной на мове,
Забудзь на час пра “языкі”.
Няхай гучаць у кожным слове
І продкі нашы, і вякі!
І. Пракаповіч

Няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта. І беларусы не выключэнне. Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная...

Шчаслівы чалавек, які мае сваю родную мову, на якой размаўляе, да якой звяртаецца ў думках, якую зберагае і носіць у сэрцы….

Роднае слова... Дзякуючы яму мы пазнаём жыццё, навакольны свет, вывучаем гісторыю і заглядваем у будучыню. Яно служыць крыніцай натхнення паэта і суцяшае сэрца. Праз слова, праз родную мову адраджаецца душа чалавека, народа, нацыі...

Роднае слова з'ауляецца адным з самых вялікіх здабыткаў кожнага народа. Яго з пашанай называюць люстэркам культуры і формай яе інавання. Родная мова з'ауляецца формай захоўвання народных традыцый, звычаяў і духоўных скарбаў, спосабам і сродкам развіцця нацыянальнай культуры.

У нас сваіх хапае слоў
Крамяных,
росных,
васільковых
Ад мурагоў і ад лясоў,
Ад светлых высяў жаўруковых.
У нас хапае слоў сваіх
(Іх пазычаць няма патрэбы)
Ад чыстых даляў веснавых,
Ад глыбіні улетку неба.
Сваіх хапае слоў у нас
Суровых, мужных, як яднанне,
Яны гучаць у грозны час
І заклікаюць на змаганне.
У нас хапае слоў такіх
Чысцюткіх, ядраных, як ранне.
Яны выказваюць услых
Пяшчоту, ласку і каханне.
Хапае слоў і гаманкіх,
І мяккіх, як у лузе травы,
І, чуйна слухаючы іх,
Запамінай не для забавы.
У нас хапае рэдкіх слоў,
І палюбі ты іх бязмежна.
Яны ад чысціні снягоў
І ад пялёсткаў беласнежных.
Яны ўвабралі звон крыніц,
Шум лесу і дыханне ночы...
Ад ліўняў і ад навальніц –
Грымяць, іскрацца і шапочуць.
Журыцца ўмеюць і звінець,
Спяваць у шумным карагодзе.
Іх трэба сэрцам разумець
І ўмець знаходзіць у народзе. Ю.Свірка

І напрыканцы хочацца нагадаць словы нашага славутага земляка Ф. Багушэвіча:
«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі …»






**23 февраля мы традиционно празднуем День защитника Отечества,** один из важнейших праздников в календаре. Это не просто день почитания солдат и бойцов, служивших и защищавших страну во время войны и невзгод, это знаменательная дата для всех, кто готов и сегодня отдать свой долг Отчизне.

Особая надежда на вас, наши дорогие мальчишки!

Вчерашние мальчишки,
Сегодня вы солдаты.
Вчера – компьютер, мышка,
Сегодня – автоматы
Кроссовки ваши берцы
С успехом заменили.
Ударом прямо в сердце:
-Не брать с собой мобильник!
А вместо куртки стильной
На вас теперь бушлаты.
Вы стерпите – вы сильные,
Ведь вы сейчас солдаты!
Подъёмы и зарядки,
И марш-бросок средь ночи…
Смелей! Вперёд, ребятки,
Хоть вы устали очень…. Л. Богданович

В нашей стране нет священнее этого долга.

Поздравляем всех мужчин, верных традициям воинов-победителей с этим знаменательным праздником.